**Быў** конь, аля з'ездзіўся – пра чалавека, які страціў свой уплыў на другіх, састарыўся.

**Бэз** Бога ні до прога – як сцвярджэнне, што без Бога і кроку не ступіш.

**Бяля** ня бяла, абы воду відзяла – пра неахайнае мыцце чаго-небудзь.

**Відаць** пана па халявах – пра фанабэрыстага чалавека, які хоча чым-небудзь выдзеліцца.

**Гдзе** мілосць, там згода, гдзе згода, там Буг – пра добрыя, цёплыя ўзаемаадносіны ў сям'і, якая жыве па загадах Божых.

**Гультай** за работу – мазоль за руку – пра чалавека, у якога ад непрывычнай фізічнай працы хутка націраюцца мазалі;

**Дагнаў** – не ўгадаў, паперадзіў – не ўгадзіў – пра чалавека, якому цяжка патрапіць словам і справай.

**Дзетак** узгадаваць – не грыбкоўназбіраць -- нялёгкая справа выгадаваць дзяцей.

**Дзеўкі** слізка кладка – лёс дзяўчыны залежыць ад учынкаў, умення сябе паводзіць.

**Дзецко** выгадоваць, цо косцёл збудоваць – вялікая адказнасць бацькоў у выхаванні дзяцей.

**Еш**, пакуль жывеш, як памрэш, то і калом не ўб'еш – гаворыцца як жартаўлівае пабуджэнне есці.

**За** добрым мужам, як за каменнай сцяной – пра добрае жыццё замужняй жанчыны, якой нічога не страшна.

**Калі** Бог не апусціць, то свіня не з'есць – пра залежнасць лёсу чалавека ад Божай волі.

**Ласы** на чужыя кілбасы – з неадабрэннем кажуць пра таго, хто сквапны, прагны да чужога.

**Не** лезь раней бацькі ў пекла – гаворыцца, калі хто-небудзь імкнецца апярэдзіць іншых, не давярае больш вопытным.

**Не** чынь кому тэго, цо тобе не міла - як парада кожнаму аб тым, як паводзіць сябе ў адносінах да другіх.

**Пайшоў**, як Барабан па крыж - пра чалавека, якому далі даручэнне, а ён не спяшаецца выконваць яго або доўга выконвае.

**Пі**, браце, пі, на старасць – торба і кій – як сцвярджэнне аб выніках пастаяннага ўжывання спіртнога чалавекам.

**Покуль** сонца ўзыдзе, раса очы выесць – пакуль дачакаешся чаго-небудзь жаданага, то прыйдзецца перанесці шмат гора.

**Сам** сібе згубіць, як чужую жану прыгалубіць – аб мужчыне, якому чужая жонка мілей за сваю.

**Служка**, вылезь з-под лужка – пра гультая, які чакае, што нехта прыйдзе і зробіць за яго справы.

**Тшымай** ензык за зэмбамі, бо заплаціш крвёў і лзамі – быць асцярожным у размове, не гаварыць лішняга, каб потым не прыйшлося адказваць за свае словы.

**Цо** добжэ, то мы, а цо кепска, то не мы – жартоўнае сцвярджэнне толькі аб добрых паводзінах і справах у пэўным месцы;

***Цыпруку*** *і на полі месца мала - пра чалавека, якому заўсёды мала месца для работы.*

***Цяжка*** *замужам, а няма дзявочай вёскі – як сцвярджэнне аб тым, што дзяўчатам патрэбна выходзіць замуж.*

***Чорт*** *лапці падраў, пакуль пару сабраў – кажуць пра мужа і жонку, якія не ўступаюць адно аднаму па сваіх якасцях.*

***Шэпты*** *хату губяць - таемныя размовы, якія становяцца прычынай сварак у хаце.*

***Язык*** *без касцей - пра балбатлівага чалавека, які нагаворыць усяго, што хочаш.*

***Якія*** *мы гаспадары, такія нашыя двары – кожны мае тое, што адпавядае яго становішчу.*

***Як*** *мукі скрыня, дык і свіня гаспадыня – і абы-якая жанчына будзе добрай гаспадыняй, калі ў хаце дастатак.*




**Складальнікі:**

***Рэспандэнты:*** *Сакалоўская Я.А., Раўлушэвіч Г.А., Марцінкевіч С.М., Ардзевіч Ф.Б., Стацэвіч Я.Б.*

***Даследчыкі:*** *Кропа А.А., актыў музейнага пакоя "Сведкі мінуўшчыны"*

***Кіраўнік:*** *Гражынская Я.Ч.*